**АГЛЯДАВАЯ ТЭМА**. У старшых класах агульнаадукацыйнай школы, акрамя манаграфічных, вывучаюцца аглядавыя тэмы, прысвечаныя аналізу развіцця беларускай літаратуры на пэўным гістарычным этапе (“Літаратура другой паловы XVI–XVII ст.”, “Беларуская літаратура першай трэці XX ст.”. Увядзенне ў школьныя праграмы аглядавых тэм абумоўлена тым, што ў старшых класах літаратура вывучаецца на гістарычнай аснове. Выкладаючы аглядавыя тэмы, настаўнік асвятляе асноўныя літаратурныя напрамкі канкрэтнай эпохі, дае сціслую характарыстыку лепшых твораў гэтага перыяду.

Аглядавая тэма, як правіла, папярэднічае вывучэнню манаграфічных тэм і з’яўляецца звязуючым звяном у сістэме літаратурнай адукацыі, аб’ядноўвае агульнай ідэяй творчасць розных пісьменнікаў, якія вывучаюцца манаграфічна. Дзякуючы аглядавым тэмам вучні старшых класаў усведамляюць сутнасць літаратуры як жывога арганізма, які не стаіць на месцы, а развіваецца. Прынцыповай адметнасцю аглядавых тэм з’яўляецца тое, што пры іх вывучэнні за параўнальна кароткі прамежак часу (1–2 гадзіны) ахопліваецца значны літаратурны матэрыял.

За апошнія дзесяцігоддзі ў школьнай практыцы выпрацаваўся парадак, у якім звычайна раскрываецца аглядавая тэма: характарыстыка асноўных гістарычных і грамадска-палітычных падзей эпохі, адлюстраванне гэтага часу ў мастацтве (жывапіс, музыка, тэатр, архітэктура), аналіз літаратурнага жыцця ў гэты перыяд, ацэнка (агляд) творчасці найбольш значных пісьменнікаў.

Паспяховаму вывучэнню аглядавых тэм спрыяе зварот да міжпрадметных сувязей, асабліва калі настаўнік выкарыстоўвае веды, набытыя вучнямі на ўроках гісторыі і сусветнай мастацкай культуры.

Асноўным метадам працы над аглядавымі тэмамі з’яўляецца лекцыя настаўніка ў спалучэнні з эўрыстычнай гутаркай. У лекцыю мэтазгодна таксама ўключыць паведамленні вучняў, мастацкае расказванне, выразнае чытанне твораў або ўрыўкаў з іх. Асаблівае значэнне пры вывучэнні аглядавых тэм надаецца працы з падручнікам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ